УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ ВІЦЕБСКАГА АБЛВЫКАНКАМА

# **М а т э р ы я л ы**

**першага этапу (школьны) Рэспубліканскай алімпіяды**
**па вучэбных прадметах**
**“Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”**
**для вучняў X класа ўстаноў адукацыі**
**Віцебскай вобласці**
**(2016/2017 навучальны год)**

ВІЦЕБСК · 2016

***Першы этап (школьны) Рэспубліканскай алімпіяды***
***па беларускай мове і літаратуры***

**Водгук на мастацкі твор**

**X клас**

Анатоль Грачанікаў
Слова

Слова лечыць і калечыць.
Ёсць адно між розных слоў,
Што ў жыцці нас чалавечыць,
Слова светлае – любоў.

Свет зачэзне і пакіне
У адчаі без надзей,
Як яно раптоўна знікне
На зямлі сярод людзей.

Дзе ж ты, ісціна святая?
З глыбіні далёкіх дзён
Слова гэта прарастае,
Як травінка праз бетон.

Перапёлка плача ў жыце,
У траве гудуць чмялі.
Не гнявіце, а любіце
Ўсё жывое на зямлі.

Каб часінай непазбежнай,
Дзе жыцця круты абрыў,
Адказаць было не грэшна:
Што любіў,
Каго любіў?

***Першы этап (школьны) Рэспубліканскай алімпіяды***
***<u>па беларускай мове і літаратуры</u>***

**Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры**
**X клас**

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *Усяго* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1.** Выпішыце словы, у якіх напісанне выдзеленых галосных заснавана: 1) на фанетычным прынцыпе правапісу, 2) на марфалагічным прынцыпе правапісу.

С***а***рдэчны, н***е*** быў, ар***ы***шт, б***е***з догляду, ц***я***жкавата, в***я***сёлы, леб***я***дзіны, бе***з*** песні, б***іё***лаг, ч***о***рнавалосы.

*Максімальная колькасць балаў - 5*

Фанетычны прынцып: ____________________________________________
____________________________________________
____________________________________________

Марфалагічны прынцып: ____________________________________________
____________________________________________
____________________________________________

**Заданне 2.** Аб’яднайце словы ў групы. Аснова для аб’яднання – аднолькавы суфікс (-ік-, -нік-, -льнік-), адсутнасць суфікса.

Будзільнік, халадзільнік, бярэзнік, батанік, палкоўнік, пернік, будаўнік, злоснік, моднік, першакурснік.

-ік-____________________________________________

-нік-____________________________________________

-льнік- ____________________________________________

адсутнасць суфікса ____________________________________________

*Максімальная колькасць балаў - 5*

**Заданне 3.** Размяркуйце словы на групы ўстарэлай лексікі:

ядваб, янычар, раць, веча, атрамант, алтын, бурса, чало, камбед.

Архаізмы:____________________________________________
____________________________________________

Гістарызмы: ____________________________________________
____________________________________________

*Максімальная колькасць балаў - 5*

**Заданне 4.** Растлумачце значэнне фразеалагізмаў

| Фразеалагізм | Тлумачэнне |
|---|---|
| Бярозаю ліцца | |
| Замыліць вочы | |
| Ехаць бачком | |
| Араць дарогі | |
| Як май змаяваў | |
| Як пугай па вадзе | |

*Максімальная колькасць балаў - 6*

**Заданне 5.** Перакладзіце словазлучэнні беларускімі аднаслоўнымі адпаведнікамі.

| Словазлучэнне на рускай мове | Беларускі аднаслоўны адпаведнік |
|---|---|
| подсолнечное масло | |
| анютины глазки | |
| жидкое мучное блюдо | |
| моховое болото | |
| кукурузный початок | |
| глиняный кувшин без ручки | |
| утомиться в дороге | |
| комнатная переносная скамеечка | |
| летучая мышь | |
| водосточная канава | |

*Максімальная колькасць балаў – 5*

**Заданне 6.** Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі словамі і часцінамі мовы.

| | |
|---|---|
| **А.** Мікола **сабе** толькі маўчыць | **1.** Назоўнік. |
| **Б.** Вясёлка – ***гэта*** радасць свету. | **2.** Клічная часціца. |
| **В.** ***Чаго*** смеху поўная хата? | **3.** Узмацняльная часціца. |
| **Г.** ***Гэта*** ўсхвалявала Алесю. | **4.** Прыслоўе |
| **Д.** ***Якое*** зорнае неба! | **5.** Указальная часціца. |

Адказ: ____________________________________________________________________

*Максімальная колькасць балаў – 5*

**Заданне 7.** Вызначце тып сказа, пастаўце ў дужках адпаведную лічбу: 1 – сказ двухсастаўны, поўны; 2 – сказ двухсастаўны, няпоўны; 3 – сказ аднасастаўны.

1. Але гэта не ўзрушыла яго. ______________________
2. За ноч падкінула сняжку. ______________________
3. А ў зубах яго шчупак. ______________________
4. У Беларусі бульбу называюць другім хлебам. ______________________
5. Сёння сход аматараў рэдкай кнігі. ______________________
6. Будзьце ласкавы, перадайце мне тую газету. ______________________

*Максімальная колькасць балаў – 6*

**Заданне 8.** Вызначце выяўленчыя сродкі мовы, якія выкарыстаў М. Багдановіч у вершы «Зімовая дарога».

Ўюцца змейкай срабрыстай дарожкі
Брызгі золата ў небе блішчаць,
І маркотныя месяца рожкі
Праз марозную мглу зіхацяць

| **Найменні выяўленчых сродкаў мовы** | **Прыклады з твора** |
|---|---|
| 1. | |
| 2. | |
| 3. | |
| 4. | |
| 5. | |

*Максімальная колькасць балаў – 5*

**Заданне 9.** Запоўніце ўсе радкі табліцы. Да псеўданімаў запішыце сапраўдныя імёны і прозвішчы пісьменнікаў. З прапанаваных выберыце і запішыце назвы твораў у патрэбны радок.

| **Сапраўднае імя** | **Псеўданім** | **Твор** |
|---|---|---|
| | Навум Прыгаворка | |
| | Ігнат Вітажэнец | |
| | Янка Купала | |
| | Якуб Колас | |

Творы для даведкі: “Пінская шляхта”, “У палескай глушы”, “Марыська чарнаброва, галубка мая”, “Мая малітва”

*Максімальная колькасць балаў – 4*

**Заданне 10.** Да прапанаваных тлумачэнняў запішыце адпаведныя тэрміны.

| | |
|---|---|
| 1. Двухскладовы вершаваны памер, стапа якога ўтрымлівае націскны і наступны за ім ненаціскны склады — | |
| 2. Жанр гісторыка-літаратурных твораў, дзе падзеі апісваліся па гадах — | |
| 3. Мастацкі прыём, разнавіднасць метафары, прыпадабненне з’яў прыроды да паводзін чалавека | |
| 4. Будова мастацкага твора, суадносіны паміж яго асобнымі часткамі — | |

*Максімальная колькасць балаў – 4*

***Першы этап (школьны) Рэспубліканскай алімпіяды***
***<u>па беларускай мове і літаратуры</u>***

**Тэмы вусных выказванняў**
**X клас**

**Білет 1**

1. Але памяць аб музыку не згінула з ім разам…

*Максім Багдановіч*

2. Нема крычала матчына сэрца ад нясцерпнае раны вайны.

*Васіль Быкаў*

**Білет 2**

1. Святлана Алексіевіч – нобелеўскі лаўрэат: «за свае паліфанічныя творы, помнік пакутам і мужнасці нашага часу».

2. Бедны той, хто не мае скарбаў вечных – скарбаў душы.

*Цётка*

**Білет 3**

1. Усё мае свой працяг жыцця,
Апроч няпраўды.

*Максім Танк*

2. Я люблю гэтыя прасторы, люблю неаглядныя ружова-сінія далі…

*Якуб Колас*

**Білет 4**

1. Ты – боль, паэзія. Ты – бой.
Ты – праўда непрыступнай вежы.

*Леанід Галубовіч*

2. Прапрадзедаў маіх жывая мова –
Майго народа першая аснова,
Душы яго шырокі, чысты свет!

*Еўдакія Лось*

**Білет 5**

1. Купала і Колас, вы нас гадавалі…

*Пятрусь Броўка*

2. Колькі вызнаў і вынес ты, краю мой мілы!

*Генадзь Бураўкін*

**Білет 6**

1. Жыццём сваім, справай і смерцю вялікі – Кастусь Каліноўскі.

*Уладзімір Караткевіч*

2. 21 лютага адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы.

**Білет 7**

1. Родны мой горад. (Родная мая вёска.)

2. Сілен, княжа, караць, галаву сілен зняць, –
   Не скуеш толькі дум ланцугамі.

   *Янка Купала*

**Білет 8**

1. Бо як ёсць у народа такія –
   Не загіне давеку народ.

   *Уладзімір Караткевіч*

2. З легендаў і казак былых пакаленняў…

   *Максім Танк*

**Білет 9**

1. Песня – душа народа.

2. О Беларусь, мая шыпшына!
   Зялёны ліст, чырвоны цвет…

   *Уладзімір Дубоўка*

**Білет 10**

1. Нязгасная зорка паэзіі нашай – Максім Багдановіч.

   *Алесь Бачыла*

2. Не дай мне Бог духоўным стаць бадзягам,
   Без памяці жывой, без каранёў…

   *Васіль Зуёнак*

**Білет 11**

1. Унукі Скарыны,
   Дзе ваш гонар, моц і краса?
   Ёсць і ў вас, як і ў іншых, святыня.
   Не давайце святыні псам!

   *Уладзімір Караткевіч*

2. Веды і дабрачыннасць як свечка, што асвятляе чалавеку шлях і не дае заблукаць.

   *Сымон Будны*

**Білет 12**

1. У нашым класе, у нашай школе ёсць такія традыцыі…

2. Люблю цябе і слухаю, прырода, такая блізкая парой любой!

   *Васіль Жуковіч*

**Білет 13**

1. Музыка ў маім жыцці.

2. Чалавек – гэта цэлы свет.

   *Кузьма Чорны*

**Білет 14**

1. Мінулае вучыць нас, як жыць сёння.

*Ян Баршчэўскі*

2. Магутнае слова ты, роднае слова!

*Янка Купала*

**Білет 15**

1. Літаратурны твор, які мяне ўразіў.

2. Збіраўся скарб, струменіўся няспынна,
Вясёлкавым ірдзеннем мне спяваў…

*Якуб Колас*

**Білет 16**

1. Свет нас прымаў як народ
Па адной палачанцы.

*Данута Бічэль*

2. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі.

*Францішак Багушэвіч*

**Білет 17**

1. Беларускія тытаны эпохі Адраджэння.

2. Прырода – найцікавейшая кніга.

*Якуб Колас*

**Білет 18**

1. Там, дзе я жыву, варта паставіць помнік…

2. Мова – душа народа.

**Білет 19**

1. Біблія – дзівосная рака…

*Францішак Скарына*

2. Жыццё даецца, каб жыццё тварыць…

*Анатоль Вярцінскі*

**Білет 20**

1. Архітэктурныя помнікі Беларусі.

2. Чалавеку патрэбна не слава…

*Сяргей Грахоўскі*